В. А. ДАНІЛАЎ

# РОЛЯ ПАРТЫЙНАГА ДРУКУ БЕЛАРУСІ Ў ПРАПАГАНДЗЕ ЭКАНАМІЧНЫХ ВЕДАЎ СЯРОД ПРАЦАЎНІКОЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ (1971—1975)

Ажыццяўленне намечаных партыяй глыбокіх пераўтварэнняў у сферы эканомікі настойліва патрабуе фарміравання работнікаў, якія спалучаюць высокі прафесіяналізм з палітычнай сталасцю і эканамічнай граматнасцю. «Перабудова грамадскага жыцця краіны, — адзначалася на лютаўскім (1988) Пленуме ЦК КПСС, — паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу з небывалай вастрынёй ставяць праблему павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў»[1]. У рашэнні гэтых задач вялікую ролю адыгрывае сістэма эканамічнай вучобы. Значнае месца ў навукова-метадычным і арганізацыйным забеспячэнні эканамічнай вучобы партыя адводзіць перыядычнаму друку. У. І. Ленін ставіў перад партыяй задачу ператварыць прэсу «ў сродак азнаямлення масы з тым, як трэба наладжваць працу па-новаму»[2].

Асаблівасці разгортвання сістэмы масавай эканамічнай адукацыі працоўных у гады дзевятай пяцігодкі вызначыла пастанова ЦК КПСС «Аб паляпшэнні эканамічнай адукацыі працоўных» ад 31 жніўня 1971 года[3]. Партыя цесна ўвязвала паляпшэнне эканамічнай адукацыі з павышэннем прафесіянальнай кваліфікацыі і вытворчай актыўнасці працоўных. Для Беларусі гэта мела асобае значэнне, таму што да пачатку 70-х гадоў адукацыйны ўзровень кіруючых кадраў сельскай гаспадаркі, не гаворачы ўжо пра радавых працаўнікоў, заставаўся яшчэ нізкім. У рэспубліцы больш чым 75 % брыгад і ферм у калгасах і саўгасах у 1971 годзе ўзначальвалі практыкі з няпоўнай сярэдняй і нават пачатковай адукацыяй[4]. Эканамічная вучоба была заклікана ўзброіць кадры неабходнымі ведамі па эканоміцы сельскай гаспадаркі, павысіць іх прафесіянальны ўзровень.

Выконваючы задачы, пастаўленыя партыяй перад сродкамі масавай інфармацыі, друк рэспублікі ў гады дзевятай пяцігодкі выкарыстоўваў розныя формы і метады прапаганды эканамічных ведаў. Важным кірункам гэтай дзейнасці з'яўлялася публікацыя матэрыялаў у дапамогу слухачам і прапагандыстам сістэмы эканамічнай вучобы. Рэдакцыі імкнуліся дапамагчы слухачам у засваенні праграмнага матэрыялу, падрыхтоўцы да заняткаў, самастойнай рабоце, дапоўніць недахоп вучэбнай і метадычнай літаратуры. Такія публікацыі рэгулярна з'яўляліся на старонках «Сельской газеты», «Мінскай праўды», «Віцебскага рабочага», шэрагу аб'яднаных і раённых газет. Звяртаў увагу на сябе патрабавальны падыход рэдакцый гэтых газет да падбору аўтараў, умелыя формы падачы матэрыялаў. Гэта адносілася і да пэўнай цыклічнасці з'яўлення артыкулаў, і да выбару прыкметных рубрык. Такімі былі: «У дапамогу вывучаючым асновы эканамічных ведаў» — у «Сельской газете», «Эканамічны лекторый» — у «Гомельскай праўдзе», «Наш эканамічны клуб» — у бабруйскай аб'яднанай газеце «Камуніст» і многія іншыя. Папулярнасцю ў чытачоў карысталіся адкрытыя на старонках газет завочныя школы, семінары, лекторыі. Змест іх матэрыялаў быў нацэлены як на прапаганду эканамічных сувязей, так і на павышэнне вытворчай кваліфікацыі чытачоў.

З кастрычніка 1971 года пачала публікацыю матэрыялаў у дапамогу працаўнікам сельскай гаспадаркі, вывучаючым асновы эканамічных ведаў, «Сельская газета». За 1971/1972 навучальны год тут была апублікавана серыя з дзевяці артыкулаў. У наступныя гады «Сельская газета» значна пашырыла свой эканамічны раздзел, паглыбілася яго навукова-метадычная накіраванасць. У 1972/1973 навучальным годзе рэдакцыя апублікавала цыкл гутарак для работнікаў сельскай гаспадаркі — слухачоў сістэмы эканамічнай адукацыі па 30-гадзіннай праграме. З'явіліся новыя рубрыкі — «У дапамогу вывучаючым асновы эканамічных ведаў» і «Эканамічны пошук». У публікацыях узрос узровень іх навукова-практычнай накіраванасці. «Магілёўская праўда» ў 1972/1973 навучальным годзе пачала публікаваць матэрыялы для вывучаючых асновы эканомікі пад рубрыкай «Эканамічная школа». Выкладанне тэорыі сацыялістычнай эканомікі базіравалася на мясцовых фактах і прыкладах. Рэгулярна з'яўляліся матэрыялы ў дапамогу слухачам сістэмы эканамічнай адукацыі

пад рубрыкай «Тым, хто вывучае эканоміку» ў ашмянскай раённай газеце «Красное знамя». Умела спалучала дапамогу працаўнікам вёскі ў паляпшэнні эканомікі з павышэннем іх прафесіянальнай кваліфікацыі маладзечанская аб'яднаная газета «Святло камунізму». У артыкулах, якія змяшчаліся пад рубрыкай «Наш завочны лекторый», асвятляліся не толькі розныя аспекты эканомікі, але і пытанні агратэхнікі, што садзейнічала павышэнню прафесіянальных ведаў земляробаў. Такімі былі матэрыялы: «Павышэнне эфектыўнасці ўгнаенняў — асноўны шлях росту ўраджаяў» супрацоўніка БелНДІ глебазнаўства і аграхіміі Л. Дзяткоўскай, «Глеба, угнаенні, ураджай» галоўнага агранома раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі Т. Крывіна, «Зберажом пасевы ад захворванняў» загадчыка дзяржсортучастка І. Сяргеева, апублікаваныя ў сакавіку-красавіку 1973 года. Шмат увагі публікацыі матэрыялаў, адрасаваных слухачам сістэмы эканамічнай адукацыі, удзялялі раённыя газеты — глыбоцкая «Шлях перамогі», добрушская «Ленінец», чэрвенская «Уперад» і іншыя.

Падобныя публікацыі аказвалі вялікую дапамогу слухачам, дазвалялі ім паспяхова авалодваць эканамічнымі ведамі. Лепшыя з іх, разлічаныя на велізарную аўдыторыю вывучаючых эканоміку, спалучалі ў сабе тэарэтычныя палажэнні марксісцка-ленінскай эканамічнай навукі з вялікім мясцовым матэрыялам. Разам з тым перыядычны друк рэспублікі далёка не поўнасцю выкарыстоўваў наяўныя магчымасці. Газетам не заўсёды ўдавалася пазбегнуць спрашчэнства і дылетантызму ў асвятленні праблем канкрэтнай эканомікі. Як паказала анкетнае апытванне кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў Магілёўскай вобласці ў 1972 годзе, многія раённыя газеты нясмела закраналі пытанні інтэнсіфікацыі, абыходзілі праблемы навуковай арганізацыі працы, укаранення і эфектыўнасці комплекснай механізацыі ў сельскагаспадарчай вытворчасці, мала публікавалі канкрэтных, эканамічна абгрунтаваных матэрыялаў аб прагрэсіўнай тэхналогіі апрацоўкі зямлі [5].

Значную ўвагу рэспубліканскія і абласныя газеты Беларусі ўдзялялі публікацыі матэрыялаў у дапамогу прапагандыстам і кіраўнікам сістэмы эканамічнай адукацыі. ЦК КПСС у жніўні 1973 года адзначаў, што работа з прапагандыстамі мае патрэбу ў далейшым паляпшэнні, таму што больш чым палова з іх не маюць неабходнай тэарэтычнай і метадычнай падрыхтоўкі [6]. У эканамічнай праблематыцы газет адно з вядучых месц займалі тэарэтычныя і метадычныя праблемы. Рэгулярна з'яўляліся тэарэтычныя матэрыялы ў «Гродненской правде». Пад рубрыкамі «У дапамогу палітінфарматару» і «У дапамогу прапагандыстам і слухачам сістэмы палітычнай вучобы» ў «Гомельскай праўдзе» прапагандысты знаходзілі вялікі матэрыял даведачна-інфармацыйнага характару. Прапагандыстам адрасаваны шэраг матэрыялаў «Магілёўскай праўды» пад рубрыкамі «Прачытай, агітатар», «Эканоміка сельскагаспадарчай вытворчасці» і «Гутаркі прапагандыста». Большасць з іх суправаджаліся практычнымі парадамі і метадычнымі каментарыямі. Так, артыкул дацэнта Белсельгасакадэміі С. Лук'янава «Сацыялістычная дысцыпліна працы» не толькі раскрываў агульнатэарэтычныя аспекты праблемы, але і даваў метадычныя парады па выкарыстанню партыйных дакументаў пры вывучэнні дадзенай тэмы на занятках [7].

Друк рэспублікі вялікую ўвагу ўдзяляў развіццю эканамічнага мыслення ў працоўных, фарміраванню ў іх навыкаў эканамічнага аналізу. З гэтай мэтай газеты змяшчалі эканамічныя зводкі і агляды ходу выканання дзяржаўных планаў. Зводкі публікаваліся штомесячна, штоквартальна і па выніках года. Агульным для публікацый падобнага роду было імкненне рэдакцый не толькі даць кваліфікаваны аналіз стану спраў у галінах сельскай гаспадаркі, але і стымуляваць працаўнікоў сяла да авалодання эканамічнымі ведамі. Аднак агульны аб'ём публікацый аналітычнага характару на старонках газет быў значна меншы, чым патрэба ў іх чытачоў. Многія публікацыі былі нізкай якасці, матэрыял падаваўся спрошчана, схематычна.

Пытанні паляпшэння эканамічнай вучобы пастаянна знаходзіліся ў полі зроку партыйных арганізацый. На пасяджэннях бюро абкомаў і райкомаў партыі абмяркоўваліся вынікі кожнага навучальнага года ў сістэме эканамічнай адукацыі працоўных. Друк рэспублікі аказваў партыйным камітэтам вялікую дапамогу ў кантролі за ходам і якасцю заняткаў, выкрываў і крытыкаваў факты неарганізаванасці і фармалізму. Актуаль-

ныя праблемы павышэння арганізацыйна-метадычнага ўзроўню заняткаў, практычнай аддачы ад іх паднімала «Магілёўская праўда». Гэтаму, у прыватнасці, быў прысвечаны цыкл артыкулаў М. Малініна, змешчаных у газеце ў 1973/1974 навучальным годзе, у якіх быў дадзен аналіз прычын няўдалых заняткаў. Трэба адзначыць, што асобныя газеты недастаткова асвятлялі ход эканамічнага ўсенавуча. Не былі падведзены вынікі 1973/1974 навучальнага года на старонках пружанскай раённай газеты «Савецкае Палессе». Са студзеня па май 1975 года не было ні адной публікацыі, прысвечанай эканамічнай вучобе ў клімавіцкай раённай газеце «Новае жыццё». Не заўсёды была высокай дзейснасць крытычных выступленняў газет. Усё гэта ў некаторай ступені зніжала ўздзейнічанне друку на развіццё эканамічнай адукацыі працоўных.

У выніку арганізатарскай і прапагандысцкай работы партыйных арганізацый пры непасрэдным удзеле друку ў 1971—1975 гадах у рэспубліцы значна павялічылася колькасць школ камуністычнай працы, эканамічных школ і гурткоў, іншых формаў эканамічнай вучобы і павышэння прафесіянальнай кваліфікацыі працоўных, узрасла колькасць слухачоў у іх. Калі ў цэлым па рэспубліцы да 1971 года эканамічнымі ведамі авалодала 381 тыс. чалавек, то ў 1974/1975 навучальным годзе гэтая лічба павялічылася да 1,2 млн чалавек, з іх больш як 500 тыс. склалі калгаснікі і рабочыя саўгасаў [8].

Выкарыстоўваючы розныя формы і метады работы, партыйны друк рэспублікі ўнёс ў гады дзевятай пяцігодкі пэўны ўклад у прапаганду эканамічных ведаў сярод працаўнікоў сельскай гаспадаркі, разгортванне сістэмы эканамічнага ўсенавуча. Тым самым газеты садзейнічалі павышэнню дзелавой кваліфікацыі работнікаў, іх грамадскай і вытворчай актыўнасці.

[1] Матэрыялы Пленума Цэнтральнага Камітэта КПСС, 17—18 лютага 1988 г. Мінск, 1988. С. 27.
[2] Ленін У. І. Творы. Т. 27. С. 178.
[3] Гл.: Экономическая газета. 1971. 1 сентября.
[4] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 2, спр. 258, л. 109.
[5] ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 9, воп. 151, спр. 7, л. 35.
[6] Гл.: Политическое самообразование. 1973. № 10. С. 5.
[7] Гл.: Магілёўская праўда. 1973. 23 жніўня.
[8] Гл.: Смирнов А. Стратегия экономического всеобуча // Коммунист Белоруссии. 1976. № 6. С. 24; Экономическая учеба на завершающем этапе пятилетки // Советская Белоруссия. 1975. 23 июля.

Г. М. ЧАЯНКОВА

## ДЗЕЙНАСЦЬ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ ПА ЎКАРАНЕННЮ НОВЫХ ФОРМ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў ЗЕРНЯВУЮ ГАСПАДАРКУ РЭСПУБЛІКІ (1976—1985)

Паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы немагчыма без шырокага выкарыстання новых форм арганізацыі працы ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Для павышэння працоўнай актыўнасці народа, дасягнення высокіх тэмпаў вытворчасці прадукцыі патрэбны, як адзначалася на чэрвеньскім (1987) Пленуме ЦК КПСС, пераход на гаспадарчы разлік, новыя метады гаспадарання, шырокае ўкараненне калектыўнага падраду і іншых прагрэсіўных форм арганізацыі працы [1].

Партыйныя камітэты і пярвічныя партыйныя арганізацыі калгасаў і саўгасаў Беларусі ў гады X—XI пяцігодак пастаянна ўдзялялі вялікую ўвагу гэтаму важнаму пытанню і назапасілі пэўны вопыт удасканалення форм арганізацыі працы ў зернявой гаспадарцы.

Значны інтарэс у гэтым плане прадстаўляе дзейнасць сельскіх партыйных арганізацый па ўкараненню групавога выкарыстання сельскагаспадарчай тэхнікі. Гэта спрыяла стварэнню рэальных магчымасцей павышэння прадукцыйнасці працы механізатараў. Упершыню новую форму арганізацыі работы тэхнікі шырока выкарысталі ў 1976 годзе земляробы Гомельскага, Рагачоўскага, Мазырскага, Рэчыцкага і Хойніцкага раёнаў. Гомельскі абласны камітэт КПБ на пасяджэнні бюро 27 мая 1977 года адобрыў ініцыятыву сельскіх механізатараў па групавому выкарыстанню